19. Летапісы, граматы, прывілеі XII–XVI ст.ст. [Электронны рэсурс] // Национальный правовой интернет портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/pravovaya-informatsiya/pomniki-gistoryi-prava-belarusi /kanstytutsyynae-prava-belarusi/letapisy-gramaty-pryvilei-khii-khvi-st-st/. – Дата доступа: 06.05.2021.

20. Любавский, М. К. К вопросу об удельных князьях и местном управлении в Литовско-Русском государстве / М. К. Любавский. – СПб. : В. С. Балашева и К°, 1894. – 49 с.

21. Любавский, М. К. Литовско-русский Сейм: опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства [Электронный ресурс] / М. К. Любавский // Электронная библиотека БГУ. – Режим доступа: http://elib.bsu.by/handle/123456789/124. – Дата доступа: 20.05.2021.

22. Любавский, М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута : очерки / М. К. Любавский. – М. : Унив. тип., 1892. – 1006 с.

23. Любавский, М. К. Очерк истории Литовско-русского государства до Люблинской унии включительно / М. К. Любавский. – Минск : Беларус. навука, 2012. – 395 с.

24. Нагаев, А. С. Практикум по истории СССР с древнейших времен до конца XVII в. : учеб. пособие для студентов-заочников 1 курса ист. фак. пед. ин-тов / А. С. Нагаев, В. Н. Огнев. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Просвещение, 1991. – 191 с.

25. Новик, Е. К. История Беларуси: с древнейших времен до 2013 г. : учеб. пособие для студентов высш. образования / Е. К. Новик, И. Л. Качалов, Н. Е. Новик ; под ред. Е. К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск : Выш. шк., 2013. – 558 с.

26. Пичета, В. И. Белоруссия и Литва XV–XVI вв. / В. И. Пичета. – М. : Акад. наук СССР, 1961. – 818 с.

27. Статут 1529 года [Электронный ресурс] // Национальный правовой интернет портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/pravovaya-informatsiya/pomniki-gistoryi-prava-belarusi /kanstytutsyynae-prava-belarusi/statuty-vyalikaga-knyastva-lito-skaga/statut-1529-goda/. – Дата доступа: 20.05.2021.

28. Статут 1566 года [Электронный ресурс] // Национальный правовой интернет портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/pravovaya-informatsiya/pomniki-gistoryi-prava-belarusi /kanstytutsyynae-prava-belarusi/statuty-vyalikaga-knyastva-lito-skaga/statut-1566-goda/. – Дата доступа: 20.05.2021.

**Прыкладны спіс пытанняў да экзамену па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі (другая палова XIII – сярэдзіна XVI стст.)»**

1. Гістарыяграфія гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.
2. Крыніцы па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.
3. Знешнепалітычныя перадумовы ўтварэння ВКЛ
4. Палітычныя перадумовы ўтварэння ВКЛ.
5. Сацыяльна-эканамічныя перадумовы ўтварэння ВКЛ.
6. Пачатак утварэння ВКЛ пры Міндоўгу.
7. Міжусобная барацьба ў ВКЛ пасля смерці Міндоўга.
8. Умацаванне ВКЛ пры Гедыміне.
9. Пашырэнне і ўмацаванне ВКЛ пры Альгердзе.
10. Дынастычная барацьба ў ВКЛ пасля смерці Альгерда.
11. Перадумовы Крэўскай уніі.
12. Крэўская ўнія.
13. ВКЛ пры Вітаўце.
14. Барацьба ВКЛ з Тэўтонскім ордэнам. Грунвальдская бітва.
15. Палітычны лад ВКЛ у 30-80-я гады XV ст.
16. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі ў XIV – сярэдзіне XVI стст.
17. Органы ўлады ў ВКЛ.
18. Органы кіравання ў ВКЛ.
19. Судовая сістэма ў ВКЛ.
20. Прававая сістэма ў ВКЛ. Статуты ВКЛ.
21. Землеўладанне ў ВКЛ у XIV – сярэдзіне XVI стст.
22. Станаўленне фальваркава-паншчыннай гаспадаркі.
23. Аграрная рэформа ў сярэдзіне XVI ст. Увядзенне валочнай памеры.
24. Катэгорыі сялянства ў ВКЛ.
25. Павіннасці сялян ВКЛ у XIV – сярэдзіне XVI стст.
26. Сялянская гаспадарка ў XIV – сярэдзіне XVI стст.
27. Вытворчасць у сялянскай гаспадарцы ў XIV – сярэдзіне XVI стст.
28. Гарады і мястэчкі Беларусі ў XIV – сярэдзіне XVI ст.ст.
29. Грамадскае жыццё гарадскога насельніцтва ў XIV – сярэдзіне XVI стст.
30. Увядзенне магдэбургскага права ў гарадах Беларусі.
31. Эканамічнае жыццё беларускіх гарадоў у XIV – сярэдзіне XVI стст.
32. Рамяство ў гарадах Беларусі ў XIV – сярэдзіне XVI стст.
33. Развіццё гандлю ў Беларусі ў XIV – сярэдзіне XVI стст.
34. Транспарт у Беларусі ў XIV – сярэдзіне XVI стст.
35. Асаблівасці этнаканфесійнага становішча на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.
36. Становішча праваслаўнай царквы на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.
37. Каталіцкая царква на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.
38. Манаскія ордэны на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

39. Спробы Рэфармацыі, з'яўленне пратэстантызму на беларускіх землях. Адказ каталіцкай царквы.

40. Контррэфармацыя на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

41. Царкоўная унія на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

42. Нехрысціянскія канфесіі на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

43. Дзейнасць праваслаўнай царквы ў сферы адукацыі на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

44. Дзейнасць каталіцкай царквы ў сферы адукацыі на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

45. Уплыў Рэфармацыі на развіццё адукацыі і кнігадрукавання на беларускіх землях.

46. Летапісанне як жанр літаратурнай творчасці на беларускіх землях у XIV – XVI стст.

47. Творчасць Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, А. Рымшы і інш. прадстаўнікоў літаратуры на беларускіх землях у XIV – XVII стст.

48. Кнігадрукаванне на беларускіх землях.

49. З'яўленне бібліятэк на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

50. Музычнае і тэатральнае мастацтва на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

51. Абарончае дойлідства на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

52. Храмавае дойлідства на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

53. Манументальны жывапіс на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

54. Кніжная графіка на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

55.Скульптура і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва на беларускіх землях у XIV – сярэдзіне XVI стст.

56. Знешнепалітычныя ўмовы існавання ВКЛ у XV – сярэдзіне XVI стст.

57. Войны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ у канцы XV – сярэдзіне XVI стст.

58. Удзел ВКЛ у Лівонскай (Інфлянцкай) вайне.

59. Палітычныя перадумовы Люблінскай уніі.

60. Падрыхтоўка да заключэння Люблінскай уніі.

61. Заключэнне Люблінскай уніі.

62. Вынікі Люблінскай уніі для ВКЛ.

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі (другая палова XIII – сярэдзіна XVI стст.»**

Мэтай метадычных рэкамендацый з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці вучэбнага працэсу, у тым ліку за кошт самастойнай работы, падчас якой студэнт становіцца актыўным суб'ектам навучання, што азначае:

— здольнасць займаць у навучанні актыўную пазіцыю;

— падрыхтаванасць мабілізаваць інтэлектуальныя і валявыя намаганні для дасягнення вучэбных мэт;

— уменні праектаваць, планаваць і прагназаваць вучэбную дзейнасць, а таксама ініцыяваць сваю пазнавальную дзейнасць на падставе ўнутранай станоўчай матывацыі;

— усведамленне сваіх патэнцыяльных вучэбных магчымасцей і псіхалагічную падрыхтаванасць да складання праграмы дзейнасці па самаразвіцці.

**Віды самастойнай работы студэнтаў**

| | |
|---|---|
| *Рэпрадуктыўная самастойная работа* | Самастойнае чытанне, прагляд, канспектаванне вучэбнай літаратуры, запамінанне, пераказ, паўтарэнне вучэбнага матэрыялу і г. д. |
| *Пазнавальна-пошукавая самастойная работа* | Падрыхтоўка паведамленняў, дакладаў, выступленняў на семінарскіх і практычных занятках, падбор адпаведнай літаратуры, напісанне рэфератаў, курсавых, дыпломных работ і г. д. |
| *Творчая самастойная работа* | Удзел у навукова-даследчай рабоце, навуковых мерапрыемствах, выкананне творчых праектаў па індывідуальных і групавых заданнях і г. д. |

**Арганізацыя і кантроль самастойнай работы**

Для паспяховага выканання самастойнай работы студэнтаў неабходна планаванне і кантроль з боку выкладчыкаў. Аўдыторная самастойная работа выконваецца студэнтамі на лекцыя і семінарскіх занятках. Для гэтага выкладчык загадзя распрацоўвае і выбудоўвае сістэму самастойнай работы, улічваючы ўсе яе формы, мэты, ажыццяўляе адбор неабходнай інфармацыі і сродкі (метадчных) камунікацый, вызначае ролю студэнта ў гэтым працэсе і свой удзел у ім. Пытанні для самастойнай работы студэнтаў, якія прыведзены ў рабочай праграме дысцыпліны, прапаноўваюцца выкладчыкамі напачатку вывучэння дысцыпліны. Студэнты маюць права дадаткова выбіраць тэмы, якія іх цікавяць, для самастойнай работы.

**Змест дзейнасці выкладчыка і студэнта пры выкананні самастойнай работы**

| Асноўныя характарыстыкі | Дзейнасць выкладчыка | Дзейнасць студэнтаў |
|---|---|---|
| Мэта выканання СР | - тлумачыць мэту і сэнс выканання СР;<br>- дае разгорнуты ці кароткі інструктаж пра патрабаванні, якія прад'яўляюцца да СР і спосабах яе выканання;<br>- дэманструе ўзор СР | - асэнсоўвае і прымае мэту СР як асабіста значную;<br>- знаёміцца з патрабаваннямі да СР |
| Матывацыя | - раскрывае тэарэтычную і практычную значнасць выканання СР, фарміруе ў студэнта пазнавальную патрэбнасць і падрыхтаванасць да выканання СР;<br>- надае студэнту матывацыю для дасягнення поспеху | - фарміруе ўласную пазнавальную патрэбнасць у выкананні СР;<br>- фарміруе ўстаноўку і прымае рашэнне аб выкананні СР |
| Кіраванне | - ажыццяўляе кіраванне шляхам мэтанакіраванага ўздзеяння на працэс выканання СР;<br>- дае агульныя арыенціры выканання СР | - ажыццяўляе планаванне і праектаванне СР, а таксама рацыянальнае размеркаванне часу, неабходнага для яе выканання |
| Кантроль і карэкцыя выканання СР | - ажыццяўляе папярэдні кантроль, які прадугледжвае выяўленне зыходнага ўзроўню падрыхтаванасці студэнта да выканання СР;<br>- ажыццяўляе выніковы кантроль канчатковага вынікаў выканання СР | - ажыццяўляе бягучы самакантроль за ходам выканання СР;<br>- выяўляе, аналізуе і выпраўляе дапушчаныя памылкі і ўносіць карэктывы ў работу;<br>- праводзіць пошук аптымальных спосабаў выканання СР;<br>- ажыццяўляе рэфлексію ўласнай дзейнасці;<br>- ажыццяўляе выніковы самакантроль вынікаў СР |
| Ацэнка | - на падставе параўнання вынікаў з эталонам, загадзя зададзенымі крытэрыямі дае ацэнку СР;<br>- выяўляе тыповыя памылкі, | - на падставе параўнання вынікаў з мэтай дае самаацэнку сваім пазнавальным магчымасцям, |

| | | |
|---|---|---|
| | акцэнтуе ўвагу на станоўчых і адмоўных баках, дае метадычныя парады па выкананні СР, вызначае далейшыя кірункі выканання СР;<br>- устанаўлівае ўзровень і вызначае якасць самастойнай дзейнасці студэнта, на падставе чаго фарміруе ў апошняга матывацыю дасягнення поспеху ў вучэбнай дзейнасці | здольнасцям і якасцям |

*Пазааўдыторная самастойная работа студэнтаў* (далей – самастойная работа) – вучэбная, вучэбна-даследчая, навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў, якая ажыццяўляецца ў пазааўдыторны час па заданні і пры метадычным кіраўніцтве выкладчыка, але без яго непасрэднага ўдзелу. Яна прадугледжвае:

– падрыхтоўку да аўдыторных заняткаў і выкананне адпаведных заданняў;

– самастойную работу па вывучэнні тэм вучэбных дысцыплін у адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі;

– напісанне рэфератаў, дакладаў, эсэ;

– выкананне кантрольных і курсавых работ;

– падрыхтоўку да кантрольных выпрабаванняў, у тым ліку да комлексных экзаменаў і залікаў;

– удзел у навуковых мерапрыемствах (выставы, канферэнцыі, сімпозіумы, семінары і г. д.).

Выкананне студэнтамі любога віда самастойнай работы прадугледжвае наступныя этапы:

– пастаноўка мэты самастойнай работы;

– канкрэтызацыя пазнавальнай задачы;

– самаацэнка падрыхтаванасці да самастойнай работы па вырашэнні пастаўленай задачы;

– выбар адпаведных сродкаў вырашэння пастаўленай задачы;

– планаванне самастойнай работы па вырашэнні задач самастойна альбо пры дапамозе выкладчыка;

– рэалізацыя праграмы выканання самастойнай работы.

## Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Унутрыпалітычнае становішча ў другой палове XIII – XV ст. | 6 | Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя перадумовы ўтварэння ВКЛ. Працэс утварэння і ўмацавання ВКЛ у другой палове XIII ст. Унутраная палітыка вялікіх князёў Віценя, Гедыміна, Альгерда. Дынастычная барацьба ў 70–90-я гады XIV ст. і 30-я гг. XV ст. Вялікае Княства Літоўскае ў часы княжання Казіміра. | Падрыхтоўка паведамленняў |
| 2 | Знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XIII – XV ст. | 6 | Знешняя палітыка ВКЛ у другой палове XIII – пачатку XIV ст. Вялікае Княства Літоўскае – цэнтр збірання ўсходнеславянскіх зямель. Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ пры Гедыміне, Альгердзе і Кейстуце. Уніі Вялікага Княства Літоўскага. Знешняя палітыка ВКЛ пры Вітаўце. «Вялікая вайна» 1409–1411 гг. Грунвальдская бітва і яе гістарычнае значэнне. ВКЛ на міжнароднай арэне ў 30-я – 80-я гады XV ст. | Падрыхтоўка паведамленняў |
| 3 | Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XIII – XV ст. | 6 | Феадалізм як сістэма грамадска-гаспадарчых адносін. Саслоўная структура грамадства Вялікага Княства Літоўскага. Формы феадальнай залежнасці. Сельская гаспадарка і становішча сялян. Гарады і мястэчкі. Геаграфія і тапаніміка гарадоў ВКЛ. Сацыяльна-эканамічнае жыццё гарадоў. Магдэбургскае права. Сацыяльны склад і становішча гарадскога насельніцтва. Гандаль і транспарт. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі. | Справаздача па індывідуальных заданнях |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4 | Фарміраванне беларускай народнасці. Культура Беларусі другой паловы XIII – XV ст. | 6 | Паняцце аб этнасе і народнасці. Роля прыродна-геаграфічнага фактару ў працэсе фарміравання беларускай народнасці. Этнаканфесійныя ўмовы фарміравання беларускай народнасці. Узнікненне і станаўленне старабеларускай мовы. Становішча прадстаўнікоў беларускага этнасу ў Вялікім Княстве Літоўскім. Складванне этнічнай тэрыторыі беларусаў. Народная творчасць. Выяўленчае мастацтва і дойлідства.<br>Развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, літаратуры і кніжнай справы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Рассяленне, заняткі і культура этнічных меншасцей і прадстаўнікоў іншых народаў у Вялікім Княстве Літоўскім. | Падрыхтоўка прэзентацый |
| 5 | Унутрыпалітычнае становішча ВКЛ у першай палове – сярэдзіне XVI ст. Усталяванне «шляхецкай дэмакратыі» | 6 | Унутрыпалітычная барацьба ў першай палове XVI ст. Абмежаванне ўлады Вялікага князя.<br>Узрастанне ролі сойма і паноў рады.<br>Кадыфікацыя права. І і ІІ Статуты ВКЛ. Органы дзяржаўнай улады і кіравання ў ВКЛ.<br>Судовая сістэма Вялікага Княства Літоўскага.<br>Прававая сістэма Вялікага Княства Літоўскага.<br>Асаблівасці і гістарычнае значэнне ўсталявання ў ВКЛ «шляхецкай дэмакратыі». | Падрыхтоўка дакладаў |
| 6 | Вялікае Княства Літоўскае на міжнароднай арэне ў першай палове – сярэдзіне XVI ст. | 6 | Абвастрэнне адносін паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай. Набегі крымскіх татар. Адносіны Вялікага Княства Літоўскага з Ордэнам і Польшчаю. Войны Вялікага Княства Літоўскага і Вялікага княства Маскоўскага, іх прычыны і вынікі. Мяцеж Глінскіх і яго гістарычнае значэнне. Палітычныя стасункі з Крымскім ханствам і Вялікай Ардой. Асаблівасці заходняй знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага. | Справаздача па індывідуальных заданнях |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 7 | Люблінская ўнія ў гісторыі Беларусі. | 4 | Перакрыжаванне інтарэсаў Польшчы, Маскоўскай дзяржавы, ВКЛ і Скандынаўскіх дзяржаў у Балтыцы. Унутрыпалітычныя перадумовы збліжэння з Польшчай. Вялікае Княства Літоўскае ва ўмовах цывілізацыйнага выбару. Значэнне Лівонскай вайны ў працэсе ўтварэння Рэчы Паспалітай. Змест і ўмовы Люблінскай уніі. Праекты Люблінскай уніі. | Справаздача па індывідуальных заданнях |
| 8 | Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе ВКЛ у першай палове – сярэдзіне XVI ст. Афармленне фальваркава-паншчыннай сістэмы. | 6 | Землеўладанне ў ВКЛ. Станаўленне фальваркава-паншчыннай сістэмы. Аграрная рэформа 1557 г. Развіццё таварнай гаспадаркі ў ВКЛ. Унутраны і знешні гандаль. Сялянская гаспадарка. Юрыдычнае афармленне прыгоннага права. Развіццё гарадоў ВКЛ. Грамадскае становішча ў Вялікім Княстве Літоўскім. | Падрыхтоўка дакладаў |
| 9 | Культура Беларусі ў першай палове – сярэдзіне XVI ст. | 6 | Становішча праваслаўя і каталіцтва ў ВКЛ. Пачатак рэфармацыі ў ВКЛ. Адказ каталіцкай царквы. Нехрысціянскія канфесіі ў ВКЛ. Уплыў ідэй Адраджэння на развіццё беларускай культуры. Развіццё літаратуры, кнігадрукавання і адукацыі. Развіццё архітэктуры, выяўленчага мастацтва і музыкі. Вытокі тэатральнай творчасці ў ВКЛ. Батлейка і яе роля ў развіцці культуры і жыцці жыхароў Вялікага Княства Літоўскага. Беларуска-літоўскія летапісы, гісторыка-мемуарная і палітычная літаратура. Грамадска-палітычная думка ў ВКЛ. | Падрыхтоўка прэзентацый |
| | **Всего** | **52** | | |

## Пералік заданняў і кантрольных мерапрыемстваў кіруемай самастойнай работы студэнта

### Тэма: Фарміраванне беларускай народнасці. Культура Беларусі другой паловы XIII – XV ст.

**Першы модуль**

Скласці канспект па тэме «Фарміраванне беларускай народнасці і этнічнай тэрыторыі Беларусі» на падставе зместу лекцый, вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў.

**Другі модуль**

Падрыхтаваць даклады па тэме «Канцэпцыі паходжання назвы Белая Русь».

**Трэці модуль**

Падрыхтаваць творчыя праекты па групавых заданнях на тэму «Культура Беларусі другой паловы XIII – XV ст.».

### Тэма: Люблінская ўнія ў гісторыі Беларусі.

**Першы модуль**

Скласці канспект па тэме «Перадумовы заключэння Люблінскай уніі» на падставе зместу лекцый, вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў.

**Другі модуль**

Падрыхтаваць даклады па тэме «Падрыхтоўка, умовы і заключэнне Люблінскай уніі ».

**Трэці модуль**

Падрыхтаваць творчыя праекты па групавых заданнях на тэму «Значэнне Люблінскай уніі для гісторыі Беларусі».

### Тэма: Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе ВКЛ у першай палове – сярэдзіне XVI ст. Афармленне фальваркава-паншчыннай сістэмы.

**Першы модуль**

Скласці канспект па тэме «Гаспадарка Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове XVI ст.» на падставе зместу лекцый, вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў.

**Другі модуль**

Падрыхтаваць даклады па тэме «Аграрная рэформа 1557 г. Афармленне фальваркава-паншчыннай сістэмы».

**Трэці модуль**

Падрыхтаваць творчыя праекты па групавых заданнях на тэму «Гарады Беларусі ў першай палове – сярэдзіне XVI ст.».

## Метадычныя парады і рэкамендацыі да заданняў

Усе тыпы заданняў, што выконваюцца студэнтамі, у тым ліку ў працэсе самастойнай работы, так ці інакш ўтрымліваюць устаноўку на набыццё і замацаванне вызначанага Дзяржаўным адукацыйным стандартам вышэйшай прафесійнай адукацыі аб'ёму ведаў, а таксама на фарміраванне ў рамках гэтых ведаў некаторых навыкаў разумовых аперацый – умення ацэньваць, аналізаваць, параўноўваць, каментаваць і г. д. Некаторыя заданні патрабуюць тлумачэння:

1. Пракаментаваць выказванне – растлумачыць, якая ідэя заключана ва урыўку, аб якой пазіцыі яе аўтара яна сведчыць.

2. Параўнаць – выявіць падабенства і адрозненне па пэўных прыкметах.

3. Абгрунтаваць адзін з некалькіх прапанаваных варыянтаў адказу – прывесці аргументы на карысць правільнасці выбранага варыянту адказу і паказаць, у чым памылковасць іншых варыянтаў.

5. Правесці аналіз – раскласці вывучаемыя з'явы на складовыя часткі, супаставіць іх з мэтай выяўлення ў іх істотнага, неабходнага і вызначальнага.

6. Тэзісна выкласці ідэю, канцэпцыю, тэорыю – выкарыстоўваючы матэрыял вучэбных дапаможнікаў і іншай літаратуры, коратка, але не на шкоду зместу сфармуляваць асноўныя палажэнні.

7. Адлюстраваць схематычна – раскрыць змест адказу лаканічна, абагульнена, пры неабходнасці ў выглядзе розных графічных формаў (схема, табліца, малюнак і г. д.).

Важным складнікам самастойнай пазааўдыторнай падрыхтоўкі з'яўляецца праца з літаратурай да ўсіх відаў заняткаў: семінарскіх, практычных, пры падрыхтоўцы да залікаў, экзаменаў, тэсціраванняў, удзелу ў навуковых мерапрыемствах.

Уменне працаваць з літаратурай азначае навучыцца асэнсавана карыстацца крыніцамі. Перш чым прыступіць да засваення зместу спецыяльнай навуковай літаратуры, рэкамендуецца чытанне падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

Вывучэнне навуковай, вучэбнай і іншай літаратуры патрабуе вядзення працоўных запісаў.

Формы запісаў могуць быць разнастайнымі: просты або разгорнуты план, тэзісы, цытаты, канспект.

Студэнтам рэкамендуецца самастойна выконваць даклады, індывідуальныя пісьмовыя заданні і практыкаванні, прапанаваныя пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў. Праца, звязаная з рашэннем гэтых задач і практыкаванняў, уяўляе сабой выгляд інтэлектуальнай практычнай дзейнасці. Яна спрыяе выпрацоўцы ўмення і звычкі выконваць задачы правільна, а таксама замацаванню навыкаў і ведаў па праблеме.

## Метадычныя рэкамендацыі па напісанні пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў

Напісанне пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў вырашае шэраг задач:

— навучанне студэнтаў самастойнаму пошуку і адбору вучэбнай і спецыяльнай навуковай літаратуры па прадмеце;

— прывіццё навыкаў рэферыравання навуковых артыкулаў па праблематыцы вывучаемых дысцыплін;

— выпрацоўка ўмення падрыхтоўкі паведамленняў, дакладаў і выступленняў;

— набыццё вопыту выступленняў з дакладамі на семінарскіх занятках;

— сістэматызацыя, замацаванне і пашырэнне ведаў і навыкаў па вывучаемых дысцыплінах;

— далучэнне студэнтаў да вырашэння праблемных пытанняў па абранай тэме работы;

— навучанне студэнтаў выкладаць матэрыял у выглядзе стройнай сістэмы тэарэтычных палажэнняў, звязаных лагічнай паслядоўнасцю і абгрунтаваных.

## Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці, якія выкарыстоўваюцца

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:
1. Вусная форма:
– гутарка;
– даклады на семінарах;

2. Пісьмовая форма:
– тэсты;
– пісьмовыя кантрольныя работы;
– пісьмовы экзамен.

**Крытэрыі ацэнак вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнта**

| Балы | Крытэрыі ацэнкі |
|---|---|
| **1** (адзін) | Адмова ад адказу, поўная адсутнасць прафесійных кампетэнцый |
| **2** (два) | Фрагментарныя веды ў межах адукацыйнага стандарту; веданне асобных фактаў з гістарычных крыніц, якія рэкамендаваныя праграмай дысцыпліны; няздольнасць выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію; пасіўнасць на семінарскіх занятках |
| **3** (тры) | Адсутнасць поўнага аб'ёму ведаў у межах адукацыйнага стандарту; веданне часткі асноўнай літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай; значныя лінгвістычныя і лагічныя памылкі ў выкарыстанні навуковай тэрміналогіі; няздольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і канцэпцыях дысцыпліны; пасіўнасць на семінарскіх занятках |
| **4** (чатыры) | Дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту; засваенне асноўнай літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай; уменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію і рабіць высновы без істотных памылак; здольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і канцэпцыях прадмета і даваць ім ацэнку; праца на семінарскіх занятках пад кіраўніцтвам выкладчыка |
| **5** (пяць) | Дастатковы ўзровень ведаў у рамках вучэбнай праграмы; уменне карыстацца навуковай тэрміналогіяй, здольнасць рабіць высновы; валоданне асноўнымі тэорыямі дысцыпліны; засваенне асноўнай літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай, неістотныя памылкі пры выкананні вучэбных і прафесійных задач |
| **6** (шэсць) | Сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі; лагічна вытрыманыя адказы; уменне арыентавацца ў базавых тэрмінах і канцэпцыях дысцыпліны, даваць іх параўнальную ацэнку; самастойная праца на семінарскіх занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| **7** **(сем)** | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; лагічна вытрыманыя адказы, здольнасць рабіць абгрунтаваныя высновы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры праграмы дысцыпліны; здольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і даваць іх крытычную ацэнку; самастойная і актыўная праца на семінарскіх занятках |
| **8** (восем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; здольнасць рабіць абгрунтаваныя высновы; валоданне метадамі комплекснага аналізу і здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне |

| | |
|---|---|
| | асноўнай і дадатковай літаратуры, якая рэкамендавана праграмай; здольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і канцэпцыях і даваць ім крытычную ацэнку; актыўная самастойная праца на занятках, удзел у групавых абмеркаваннях |
| **9** (дзевяць) | Выкананне патрабаванняў вучэбнай праграмы на высокім узроўні; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па прадмеце; бездакорнае валоданне тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі; стылістычна пісьменнае, лагічна правільнае пабудову матэрыялу; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай дысцыпліны, даваць ім крытычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні ў іншых дысцыплінах; уменне самастойна творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі; веданне і умелае выкарыстанне сучасных інфармацыйных і адукацыйных тэхналогій |
| **10** (дзесяць) | Безумоўнае выкананне патрабаванняў вучэбнай праграмы на высокім узроўні; уменне самастойна выяўляць і выкарыстоўваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі вучэбнай дысцыпліны; свабоднае валоданне інфармацыяй з асноўных і дадатковых крыніц у вырашэнні прафесійных задач; пошукавая творчая дзейнасць па вырашэнню актуальных праблем вывучаемай дысцыпліны |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя Беларусі | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Змен няма | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 9 ад 28.03.2017 г.) |
| Гісторыя ўсходніх славян (Расія і Украіна) | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Змен няма | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 9 ад 28.03.2017 г.) |